# ФАРМІРАВАННЕ «НОВАГА БЫТУ» Ў БССР У ПЕРЫЯД НЭПА (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»)

**Т. У. Пецюкевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*tatstsyana98@mail.ru;*
*навук. кір. – А. Ф. Паддубская, канд. гіст. навук, дац.*

У артыкуле разглядаецца праблема адлюстравання мерапрыемстваў палітыкі «новага быту» ў БССР у перыяд НЭПа ў перыядычным друку на прыкладзе матэрыялаў штодзённай газеты «Звязда». Мэтай мерапрыемстваў па рэфармаванню паўсядзённага жыцця было выхаванне чалавека новага камуністычнага грамадства – «адукаванага, дзейснага і культурнага вытворцы і грамадзяніна Савецкага Саюза». Такім чынам, актуальнасць тэмы вызначаецца ўплывам паўсядзённасці на фарміраванне звычак чалавека і яго ментальнасць. Новая паўсядзённасць будавалася на барацьбе з праявамі мяшчанства, рэлігійнай абраднасцю, вызваленні жынчыны ад хатняй працы, прапагандзе калектыўных формаў жылля. Асвятленне праблем і дасягненняў дадзенай палітыкі грунтавалася на дыхатаміі элементаў старога і новага быту як састарэлых і прагрэсіўных з’яў.

***Ключавыя словы:*** палітыка «новага быту»; паўсядзённасць; мяшчанства; перыядычны друк.

Тэрмінам «новы быт» савецкая ўлада вызначала змены ў свядомасці, быце, звычках рабочага, якія былі неабходны для яго станаўлення як «адукаванага, дзейснага і культурнага вытворцы і грамадзяніна Савецкага Саюза» [1, с. 4]. Палітыка «новага быту» асвятлялася на старонках штодзённай газеты «Звязда», якая з’яўлялася органам друку ЦК КП(б)Б. Значную ролю ў гэтым працэсе гралі рабкоры – пазаштатныя карэспандэнты выдання з пралетарскага асяродку. У выступленні Л. Д. Троцкага на маскоўскім з’ездзе рабочых карэспандэнтаў у 1924 г. адзначалася, што асноўная задача рабкора – «паказаць, што адбываецца на фабрыцы, у кааператыве, у школе, на вуліцы, г.з. знайсці неабходную перспектыву для аскепкаў мінулага і зародкаў будучыні» [2, с. 27].

Мерапрыемствамі ў бытавой сферы, якія атрымалі найбольшае абмеркаванне на старонках газеты, сталі: барацьба з праявамі мяшчанства, замена рэлігійнай абраднасці на чырвоную, вызваленне жанчыны ад цяжару хатняй працы, прапаганда калектыўных формаў жылля. Большасць публікацый тычылася горада, бо вясковае насельніцтва, у сілу сваёй традыцыйнасці, было менш успрымальным у адносінах да новаўвядзенні ў такой кансерватыўнай сферы жыцця, як быт.

Праблемы і дасягненні «новага быту» часта асвятляліся ў кантэксце дыхатаміі старога і новага ладу жыцця як састарэлага і прагрэсіўнага, што яскрава бачна на прыкладзе святкавання Новага 1923-га года. Свята пралетарыята апісвалася як узорна-паказальнае: «весяліліся без танцаў, без масак, без моцных напояў – без неад’емных атрыбутаў буржуазнай весялосці». Новы год прадстаўнікоў новай буржуазіі атрымаў рэзка негатыўную характарыстыку: «Ярка гарэлі агні Дзяржтэатра. Валам валіла туды моладзь. Толькі ўжо не камсамольская, а нэпаўская… Спекулянты і падпольнікі, сахараўшчыкі і валютнікі – гладка паголеныя, раздушаныя, пад хмяльком. Жанчыны ў шаўках, вялікіх дэкальтэ, намазаныя, нафарбаваныя… маска без густа і намёка на што-небудзь… Вясялосць без думкі, мэты і ідэі». [3, с. 3].

Змешчаная вышэй цытата выкрывала праявы мяшчанства, з якімі савецкая ўлада планавала змагацца. Пад мяшчанствам разумеўся заможны лад жыцця, нагадваючы дарэвалюцыйны быт, рысамі якога лічылася накапленне рэчаў, асобныя прадметы інтэр’ера, некаторыя віды адзення і абутку. Па вызначэнні «Звязды», сродкам і мэтай існавання буржуазнай жанчыны з’яўляліся капялюшы, строі чаравікі і аборты (апошняе дазваляла захоўваць фігуру) [4, с. 3]. Мяшчанствам лічылася нават упрыгожванні: адзін рабочы пісаў, што яго жонка купіла «гэтыя самыя распраклятыя завушніцы, уваткнула іх у вушы і ходзіць павай». Пасля шматлікіх заўваг мужа, што ўсё гэта з’яўляецца праявай мяшчанства, жанчына адказала: «Што хачу, то і раблю…А калі яшчэ раз на завушніцы нападзеш – развод» [5, с. 2].

Праявамі старога быта лічыліся таксама хуліганства, п’янства, азартныя гульні. «Звязда» выкрывала выпадкі п’янства ў рэгулярных нататках «Пра п’яныя справы», якія павінны былі адыгрываць ролю «дашкі ганьбы» для аматараў выпіць. Напрыклад, у ліпені 1924 г. газета пісала пра рабочага завода «Энэргія», які ў адказ на колкае слова брата ў адрас нявесты паспрабаваў разбіць стакан аб яго галаву. А адзін з членаў прафсаюза рабкамхоза пасля шасці бутэлек піва і адной бутэлькі вішнёўкі «праізнёс грамавую прамову пра камуністаў, якія не даюць магчымасці напівацца, як у старыя часы» [6, с. 4].

У 1925 г. на старонках газеты разгарнулася дыскусія аб непрызнанні страхавым выпадкам траўмы, атрыманай ў п’яным выглядзе, а кваліфікаваць такія дні хваробы ў якасці прагулаў [7, с. 3]. Сярод мерапрыемстваў па барацьбе са злоўжываннем алкаголя прапаноўвалася абмежаваць часы гандлю водкай і яе колькасць, забараніць продаж у святочныя дні, разгарнуць шырокую кампанію па барацьбе з алкаголем па партыйнай і прафсаюзнай лініях, выкрываць выпадкі п’янства ў газетах [8, с. 3].

Другой праблемай лічыліся азартныя гульні на грошы. У верасні 1923 г. п'янства сярод рабочых мінскай абойнай фабрыцы амаль знікла, але значная частка рабочых пачала хадзіць у клуб-лато [9, с. 4]. У некаторых мінскіх сталоўках рабочыя ў «коле ап'янелых «нэпачэй» рэзаліся на більярдзе» амаль заўсёды на грошы [10, с. 4].

Прапагандавалася замена рэлігійнай абраднасці на чырвоную. У якасці прагрэсіўнай з'явы разглядалася замена царкоўных хрэсьбінаў дзіцяці на чырвоныя хрэсьбіны (акцябрыны), набывала папулярнасць наданне нованароджаным імя ў гонар дзеячаў рэвалюцыйнага руху. Напрыклад, у кастрычніку 1923 г. рабочы завода «Варшавянка» арганізаваў для свайго сына «рабочыя хрэсьбіны» ў клубе. Хлопчык атрымаў імя Карл у гонар Карла Лібкнехта [11, с. 4].

Нараўне з барацьбой супраць нецэнзурных словаў рэкамендавалася змагацца з «бажбой» – выкарыстаннем выразаў «ей богу», «дай бог кожнаму» і г.д. Было нават прапанавана ўвесці штраф памерам 15 кап. золатам на карысць Паветранага флоту [12, с. 4].

Важнай складаючай палітыкі «новага быта» стаў тэзіс аб вызваленні жанчыны ад цяжару хатняй працы дзеля прыцягнення яе ў працоўную і грамадскую сферы. Падкрэслівалася, што «толькі яслі, дзіцячыя садкі, грамадскае харчаванне, грамадскія пральні вызваляць абсалютна працуючых жанчын ад дробных хатніх клопатаў» [13, с. 5].

У якасці перадавой фомы жылля прапагандаваліся камуны – супольнае пражыванне людзей, заснаванае на абагульненні маёмасці і калектыўным вядзенні гаспадаркі. Напрыклад, у 1923 г. камуну стварылі 9 выпускнікоў мінскай цэнтральнай партыйнай школы: арэндавалі кватэру, адрэмантавалі мэблю, купілі прадметы хатняга быту. На агульных сходах камунары вызначалі «смету» расходаў, на якую купляліся прадукты. Штодзённа выбіраўся дзяжурны, які адказваў за вядзенне гаспадаркі [14, с. 3]. Рух за стварэнне камун не атрымаў значнай папулярнасці ў БССР па прычынах радыкальнасці ідэі і вострага недахопу жылля.

Палітыка «новага быта» была паступова звернута напрыканцы 1920 -х гг. Асвятленне дадзенай тэмы на старонках цэнтральнай газеты вызначала яе важнасць для ўладаў, аднак пры гэтым пастаяннай рубрыцы створана не было. Пасля 1925 г. колькасць публікацый на тэму «новага быту» ў «Звяздзе» паступова зніжаецца, што сведчыла аб страчванні актуальнасці для грамадства. Ідэі «новага быта» гучалі занадта радыкальна для большай часткі насельніцтва і не атрымалі шырокай падтрымцы. Дадзеную палітыку можна ахарактаразаваць як эксперымаент з паўсядзённасцю, які так і не быў завершаны.

На заканадаўчым ўзроўні згортванне палітыкі «новага быта» было аформлена пастановай ЦК ВКП(б) «Аб працы па перабудове быта» ад 16 мая 1930 г., якая асудзіла «левацкія» прапановы перахода да абагульнення ўсіх бакоў быта рабочых [15, с. 119]. Пад апошнім разумеўся ў першую чаргу рух за стварэнне камун з калектыўным вядзеннем гаспадаркі. Рэзалюцыя пленума ЦК ВКП(б) «Аб Маскоўскай гарадской гаспадарцы і аб развіцці гарадской гаспадаркі СССР» ад 15 чэрвеня 1931 г. падцвердзіла неабходнасць барацьбы з «усялякага рода пражэктарскімі прапановамі» [16, с. 326].

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Культура и быт// Звезда. – 1923. – 16 октября. – С. 4.
2. *Троцкий, Л. Д.* Вопросы быта: эпоха «Культурничества» и ее задачи / Л. Д. Троцкий. – 3-е изд. – М.: Гос. изд-во, [ок. 1923]. – 166 с.
3. Красные штрихи. Кто как веселится//Звезда. – 1923. – 9 января. – С. 3.
4. Суд над абортом. Четыре «К» // Звезда. – 1923. – 24 апреля. – С. 3.
5. Серьги (рассказ рабочего)// Звезда. – 1923. – 22 июня. – С. 2.
6. Про пьяные дела// Звезда. – 1924. – 4 июля. – С. 4.
7. На борьбу с пьянством!// Звезда. – 1925. – 17 ноября. – С. 3.
8. На борьбу с пьянством// Звезда. – 1925. – 21 ноября. – С. 3.
9. «Не вмер Данила, а болячка его задавила»// Звезда. – 1923. – 15 сентября. – С. 4.
10. Чистка рабочих карманов// Звезда. – 1923. – 8 сентября. – С.4.
11. К новому быту. На рабочих «крестинах»// Звезда. – 1923. – 3 октября. – С. 4.
12. К новому быту! Божбу выкинуть из обихода!// Звезда. – 1923. – 30 сентября. – С. 4.
13. Еще о новом быте// Звезда. – 1923. – 17 июня. – С. 5.
14. Кусочек нового быта// Звезда. – 1923. – 30 августа. – С. 3.
15. О работе по перестройке быта: постановление ЦК ВКП(б) от 16 мая 1930 г., №146// КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. – 1984. – Т.5. – С. 118–119;
16. О Московском городском хозяйстве и о развитии городского хозяйства СССР: резолюция Пленума ЦК ВКП(б) от 15 июня 1931 г., №165// КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. – 1984. – Т.5. – С. 31–3326.